**Залаты** фонд працаўнікоў вобласці // Браслаўская звязда. – 2023. – 22 лют. – С. 1.

# ЗАЛАТЫ ФОНД ПРАЦАЎНІКОЎ ВОБЛАСЦІ




Прэмію «Чалавек года Віцебшчыны» сёлета ўручылі пяцідзесяці прадстаўнікам прадпрыемстваў і арганізацый паўночнага рэгіёна. Нагадаем, у ліку лаўрэатаў высокай узнагароды – браслаўчанка Вера Маслякова, апаратчык стэрылізацыі кансерваў віліяла «Браслаўрыба».

Прэмія Віцебскага аблвыканкама прысуджана жыхарам вобласці за ўкпад у развіццё рэгіёна і высокія паказчыкі ў працы ў 2022 годзе. Узнагароды атрымалі прадстаўнікі прамысловасці, гандлю і паслуг, малога і сярэдняга бізнесу, аграпрамысловага комплексу, лясной гаспадаркі, сацыяльнай сферы, культуры, навукі, спорту, спецыялісты, занятыя ў фінансавай сферы, ЖКГ і іншых значных галінах эканомікі рэгіёна.

«Гэтыя 50 чалавек – залаты фонд нашай вобласці, яны лепшыя ў сваіх галінах. Кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, якія шмат чаго дамагліся і многае робяць цяпер. Таленавітая моладзь, якая будзе рабіць нашу вобласць яшчэ лепшай і больш паспяховай. Што тычыцца задач на гэты год, то, кажучы ў двух словах, гэта пастулальнае развіццё. Трэба дабудаваць тое, што пачалі, – бальніцы, дзіцячыя сады, школы. Пункты росту нашай вобласці – гэта нафтавая прамысловасць, біятэхналогіі, тая вытворчасць, якая развіваецца ў Аршанскім, Міёрскім, Полацкім раёнах. І слову «турызм» трэба надаць сапраўдны сэнс, таму што наша вобласць вельмі прыгожая і славіцца сваімі прыроднымі багаццямі», – падкрэсліў старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін.

Дарэчы, сёлета цырымонія ўзнагароджання прайшла ў асабліва ўрачыстай абстаноўцы, бо Віцебская вобласць святкуе сваё 85-годдзе. У гэтай сувязі кіраўнік рэгіёна адзначыў, што ў гісторыі Віцебшчыны за гэты час былі і трагічныя, і радасныя, напоўненыя светам падзеі. «Гэта пэўная вяха, калі можна ўбачыць, чым жыў рэгіён учора і што трэба зрабіць, каб заўтра жыць стала яшчэ лепш», – сказаў А. Субоцін, дадаўшы, што дзякуючы людзям, якіх сёння ўшаноўваюць у Віцебску, паўночны рэгіён не здае сваіх пазіцый і выходзіць у некаторых паказчыках у лідары.